

ПА ДОБРАЙ ПЕРШАМАЙСКАЙ ТРАДЫЦЫІ

4

У ГОСЦІ ДА ГЕРОЯ

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 мая 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 86 (30220)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **Дзяржаўнай установе «Палац Рэспублікі» Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прысвоены статус «Нацыянальны».**
- Доля беларускай прадукцыі ў магазінах Віцебскай вобласці па выніках 2023 года склала амаль 67 працэнтаў.
- **Тэрміновыя рублёвыя дэпазіты фізічных асоб у банкаўскім сектары выраслі ў сакавіку бягучага года ў параўнанні з папярэднім месяцам на Br176,6 млн, або на 2,1 працэнта, і на 1 красавіка 2024 года склалі Br8,6 млрд.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ГУРСКІ, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай Акадэміі навук:**

*«У 2023 годзе ўсе запланаваныя мэтавыя паказчыкі НАН Беларусі былі выкананы. Агульны аб'ём вытворчасці павялічыўся больш як на 14 працэнтаў. Аб'ём вытворчасці высокатэхналагічнай навуковай прадукцыі вырас больш як на 20 працэнтаў. У адпаведнасці са статутам і даручэннямі кіраўніка дзяржавы, прыярытэтнымі кірункамі развіцця акадэміі з'яўляюцца авіякасмічныя даследаванні, даследаванні ў сферы біятэхналогій, развіццё мікраэлектронікі, даследаванні палярных рэгіёнаў Зямлі, найноўшыя тэхналогіі ў сферы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, якія актыўна ўкараняюцца ў вытворчасць».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ РАЗУМЕЕМ, ШТО МЫ ВЫРАТАВАЛІ СВАЮ КРАІНУ»

### За што Прэзідэнт удзячны жыхарам Касцюковіцкага раёна і якія задачы перад імі ставіць — акцэнты рабочай паездкі

**У графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — рабочая паездка на паўднёвы ўсход Магілёўскай вобласці. Калісьці Касцюковіцкі раён пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Але сёння тут віруе жыццё. Як раён аднавіўся ад наступстваў катастрофы і як жыве цяпер, кіраўнік дзяржавы азнаёміўся асабіста. Аднак праграма камандзіроўкі аказалася шырэйшай за традыцыйныя «чарнобыльскія» паездкі Прэзідэнта.**

Першае пытанне — старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатолю Ісачанку: як рэалізавана праграма па развіцці паўднёвага ўсходу вобласці. Губернатар запэўніў, што праграма спрацавала. Але на гэтым размова пра развіццё гэтага рэгіёна не заканчваецца. Аляксандр Лукашэнка анансаваў сур'ёзную нараду аб рэалізацыі праграмы развіцця паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны. Ён даручыў на канец ліпеня — пачатак жніўня запланаваць у рэгіёне адпаведную нараду. На нарадзе плануецца заслухаць справаздачу кіраўніка рэгіёна і паўднёва-ўсходніх раёнаў. «Сур'ёзная будзе размова», — папярэдзіў беларускі лідар. Адпаведная размова потым будзе прысвечана і ўсходняй частцы Гомельскай вобласці.

Як звычайна падчас рабочых паездак у рэгіёны, Аляксандр Лукашэнка не абмяжоўваецца толькі пытаннямі канкрэтнай мясцовасці. Тэзісы, якія агучвае Прэзідэнт, маюць значэнне і для ўсёй краіны. Адзін іх датычыцца меліярацыі. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што цяпер яна праводзіцца па ўсёй краіне. Па словах



Фота БелТА.

Аляксандра Лукашэнкі, і самі гаспадаркі павінны падключацца да культуртэхнічных работ. Задачы кіраўнікоў — зацікавіць іх гэтай работай, а затраты кампенсаваць. «Падумайце, як гэта зрабіць», — даручыў кіраўнік дзяржавы. Яшчэ адна важная для Касцюковіцкага раёна, Магілёўскай вобласці і ўсёй краіны задача — навесці парадак на зямлі. Прэзідэнт нагадаў, што раней даручаў вырашыць праблемы са старымі фермамі, якія сёння не выкарыстоўваюцца. Гэтыя аб'екты, як падкрэсліваў Аляксандр Лукашэнка, не павінны быць «помнікамі безгаспадарлівасці», а вызваленыя землі неабходна выкарыстоўваць пад патрэбы сельскай гаспадаркі. «Трэба падключыць МНС і ваенных, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. — У нас вельмі шмат безгаспадарлівасці на зямлі. Знішчыць, трэба мабілізоўвацца».

СТАР. 2

Пашана

# Апагей здзяйсненняў і спраў

### Абноўленая Рэспубліканская дошка Гонару адкрылася ў Мінску

**Па традыцыі, якой сёлета 25 гадоў, адкрыццё адбылося напярэдадні свята Працы. Згодна з адпаведным указам Прэзідэнта, сёлета па выніках 2023 года на Рэспубліканскую дошку Гонару занесены 11 арганізацый прамысловасці; тры арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у будаўніцтве; дзевяць арганізацый сельскай і рыбнай гаспадаркі; дзве арганізацыі лясной гаспадаркі; 28 арганізацый сферы паслуг (арганізацыі гандлю, адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры, сацыяльнага абслугоўвання і іншыя).**

СТАР. 3



Фота Кацярыны УРБАН

Будзьце пільнымі!

# ДАЧНЫЯ ДАМЫ, КВАТЭРЫ, АЎТАМАБІЛІ, МАТАЦЫКЛЫ, КАМП'ЮТАРЫ

### Што маглі б купіць ахвяры махляроў



**Тэма згублених у выніку падману грошай не страчвае сваёй актуальнасці. Амаль штодзень гродзенскія праваахоўнікі рэгіструюць такія факты. Прычым формы махлярства становяцца ўсё больш разнастайнымі. Апошнім часам шырока распаўсюджваецца кіберзлачынства. Штотыднёвы падлік страт жыхароў рэгіёна, якіх удалося падмануць махлярам, уражвае.**

СТАР. 13